проза

Адам Глобус



...я не хацеў бы, каб нехта пасварыў нас, не хацеў бы нават, каб гэта быў сам Бог...

# Брат

***Словы пра брата майго Міраслава (Мірыка) Адамчыка***

***ВОЧЫ***

Калі Мірык нарадзіўся, вочы ў яго былі цёмна-цёмна-сінія, як берлінская лазура, а потым паступова зрабіліся «чорнымі» – цёмна-карымі. Гэта, пэўна, самае чароўнае пераўтварэньне, якое я ў ім назіраў.

***КОТ***

Калі нарадзіўся брат, да нас зайшоў мой найлепшы з тагачасных сяброў першакласьнік Юра. Ён вельмі сур’ёзна агледзеў тады яшчэ безыменнага чалавека і сказаў: «Што такое брат? Вось у мяне ёсьць кот Мурза, ён лепшы за твайго брата...» Юравы словы зьня-

важылі мяне страшэнна. Які кот? Які Мурза? Які Мурзік? Я ледзь стрымаўся, каб ня ўдарыць Юрку, але пашкадаваў брата будзіць. Сон брата ў тыя дні быў найкаштоўнейшай зьявай у нашай сям'і. Тую зьнявагу я не забыў, і таму не спачуваў Юру, калі ягоны Мурза здох. Кот заблыхасьціў. Юраў тата памыў яго дустам, знакамітым DDT. Кот аблізаў сябе пасьля памыўкі і выпруціўся. А я, грэшна радаваўся сябравай бядзе. Толькі тая гадкая радасьць ня змыла крыўду. Дагэтуль я не дараваў зьедлівага «Што такое брат?», недзе там – у самых глыбінях душы – не дараваў. Ёсьць рэчы, якія проста не даруюцца ніколі.

### *СОН*

Калі мы з маці прыехалі да Мірыка ў вайсковую вучэбку, што месьцілася ў Чарнаўцах, і забралі яго на суткі, дык мяне вельмі зьдзівілі зьмены, якія адбыліся з братам. Юнак-студэнт пераўвасобіўся ў істоту, якую ў народзе абразьліва называюць пушачнае мяса. Худы, да нейкай спружыністай драўлянасьці, Мірык глядзеў на сьвет вачыма, якія ў адначасьсе кантралявалі вонкавыя зьявы і ўглядаліся ў глыбіні ўласнай прыгнечанай душы. «Я магу спаць стоячы, — салдацкім голасам распавядаў брат, — магу спаць ідучы. Ісьці і спаць. Магу бегчы і спаць. А галоўнае, я магу бегчы і спаць з расплюшчанымі вачыма...» Мама вельмі ўразілася гэтымі здольнасьцямі. А я ўзрадаваўся, бо з такога воіна ня зробіць пушачнае мяса ніводзін генералісімус.

### *УДАР*

У кожнага ўзьнікае жаданьне разьбіць твар сабепадобнаму. І раней ці пазьней абставіны складаюцца на тое каб злосьць увасобілася ў бойку. Чалавек істота ваенная. Нічога не паробіш. З астатнімі нічога ня зробіш. А сябе ўсё ж на пэўны момант можна пераарыентаваць. Удар, які Мірык абрынуў на тоўстае дзьвярное шкло каштаваў яму шмат. Шкло разьляцелася на аскепкі, але і кулак ператварыўся ў крывавую кашу. Геніяльны, без перабольшаньняў, хірург Пал Палыч Беспальчук нейкім магічным чынам разабраўся ў крывавай кашы і сшыў, склаў, аднавіў братаву руку наноў. Тыдні са тры Мірык праляжаў у бальніцы Беспальчука, страціў кілаграмаў дваццаць і выйшаў падобны да падлетка. Яго сустрэла Таня, другая жонка, з-за якой і разьляцелася тоўстае шкло. Мусіла разьляцецца на кавалачкі галава Танінага першага мужа, які цяжка перажываў страту жонкі і часткі рэчаў. Каб хоць неяк выглядаць па-мужчынску, ён не даваў Тані яе вопратку, а тут прыйшоў Мірык. Ударыў ён адбітак Танінага мужа, ударыў адлюстраваньне, а не арыгінал, разбіў цень, каб істота, што цень наводзіла, спалохалася і ўцякла. Істота зьбегла. Скалечаная рука гаілася доўга. Больш за год брат не адчуваў пальцамі ні холаду ні цяпла. Бывала, курачы цыгарэту, заўважаў як на пальцы ўзьдзімаецца пухір апёку, але болю ня чуў. Жахлівы пах спаленай чалавечай скуры напаўняў пакой, але Мірык ні разу не пашкадаваў пра тое, што зрабіў.

## *БЕНЗІН*

Як лёгка гарыць бензін — без усялякага напружаньня. Гэта чыста мужчынскі занятак паліць бензін, як піць сьпірт. Пра гарэньне бензіну мы з Мірыкам загаварылі, калі нам не вярнулі грошы. Быў такі час, калі грошы да нас прыходзілі лёгка, а таму шмат каму здавалася, што іх можна пазычыць і не вярнуць. Так проста: узяў, сказаўшы што вернеш, і нібыта забыўся. Толькі грошы, насамрэч, прыходзілі да нас цяжка, і за кожны рубель-даляр мы адпрацоўвалі напоўніцу. А тут паверылі, як верылі нам, далі, а праз месяц зразумелі, што ніхто нам не зьбіраецца вяртаць пазыку. Вялікадушша, усёдараваньне, любоў да чалавека – выдатныя рэчы, але яны ня тычацца злодзеяў і шэльмаў. Папярэджаньні шэльма зносіў спакойна. Абяцаў, хлусіў, час цягнуў... Вось і ўзьнікла думка: а ці ня даць яму панюхаць бензіну. Ёсьць жа асобы, якім падабаецца вастрыня бензінавай пары. Шэльма жыў на другім паверсе, над аптэкаю. Ягоныя кватэрныя дзьверы мы падперлі драўляным брусам, каб ня выскачыў. Бутэльку з бензінам кідаў я. Калі б кідаў Мірык, напэўна, пацэліў бы ў шыбу, а я расхваляваўся і ўпіндзюрыў у раму і край сьцяны. Такая злосьць мяне ахапіла, хоць Мірык і крычаў, што трэба ўцякаць, а я ўсё ж выдраў кавалак асфальту, вялікі, памерам з два кулакі і зафундырыў у шыбу. Ну мусіў шэльма нюхнуць бензіну. Мусіў і нюхнуў. У дварах нас чакала машына, так што праз тры хвіліны мы зноў былі на дні нараджэньня ў сябра. Алібі нікому ня шкодзіць, калі намерваешся даць панюхаць бензіну. Пах падзейнічаў. Грошы вярнуліся. Ня ўсе, але збольшага. І справа тут не ў грашах. Галоўнае, мець брата, з якім можна любой шэльме даць панюхаць бензіну.

## *КРАІНА Ў КРАТАХ*

У рок-гурта «Уліс» ёсьць песьня:

Рака, што цячэ ля карчмы,
Каля рэчкі – мур.
Трынаццаць літар на ім.
У літарах смур...

А потым рэфрэн: «Краіна ў кратах!!!» Выконваў тую кампазіцыю Андрэй Патрэй. Геніяльна выконваў. Калі адхіліцца ў бок белрок-н-ролу, дык акрамя Андрэя геніяльных вакалістаў у ім не было. Можа праз гэта Патрэй і звар'яцеў, праз сваю геніяльнасьць. Выбраны ён быў, непараўнальны, ненармальны... Шкада, канешне, што Патрэй захварэў незваротна, але ж песьня засталася. Песьня пра Краіну ў кратах. А надпіс той зрабіў мой брат. Даўно, у 1984 годзе. Ні пра якую незалежнасьць ніхто і думаць ня думаў. Панавала суцэльная задуха таталітарызму. Свабода жыла на дысідэнцкіх варэльнях і ў майстэрнях мастакоў. Ва-

семнаццацігадовы Мірык са сваім аднакласьнікам Сашкам пайшлі да Сьвіслачы, дзе ў яе ўпадае Няміга, слаўна апетая ў «Слове аб палку Ігаравым», і стварылі першае менскае графіці, ці як цяпер кажуць *піс,* адно, што без аўтарскага подпісу. За подпіс з пісам можна было атрымаць гадоў пяць турмы. Калі цяпер хлопцы атрымліваюць месяцы за гумарыстычныя надпісы, то тады сьвяціла поўная праграма з дурдомам і турмою. Але і канспірацыя і падыход да справы былі іншыя, сур'ёзныя, без карнавальнага разманьдзяйства і без справаздачаў за скарыстаныя балонікі. Сэрца балела за Бацькаўшчыну. Таму і колькі не зафарбоўвалі тыя 13 літараў, а ўсё адно праступала на муры: «Краіна ў кратах».

## *ЧУЖЫЯ СЛОВЫ*

Ці варта згадваць чужыя словы пра брата, калі сваіх яшчэ шмат не сказаных? І ўсё ж працытую, дзеля больш размаітай і аб'ектыўнай партрэтнасьці... «Мірык – зьвер! Так, так... Мірык – зьвер! І я яго паважаю... У вас усім кіруе Мірык, мне так падаецца. І гэта правільна. Кіраўнік мусібыць адзін, каб справа не размазвалася. Кіраўнік мусібыць зьверам!» – так разважаў настаўнік біялогіі Карпейчык. А паліграфіст Хацкевіч за бутэлькаю віскі ў самалёце сказаў наступнае: «Мірык мне гаворыць – як Валодзя скажа, так і будзе. Уяўляеш, як гэта важна мець у жыцьці чалавека, якому можна цалкам давяраць... Як Вова скажа – так і будзе! У мяне няма такога. Я ў справах застаўся зусім адзін. Я люблю працаваць адзін, прымаць рашэньні, за ўсё сам адказваць... Але часам так хочацца быць меншым, некага паслухаць, некаму даверыць свае самые патаемныя думкі наконт усіх спраў. Каб нехта сказаў, і я паверыў...» Чужыя словы, яны таму і чужыя, што не свае, а таму не зусім дакладныя, але недзе паміж развагамі Хацкевіча і Карпейчыка ляжыць чыстая праўда.

## *ЗБРОЯ*

Калі хто любіць па-сапраўднаму зброю ў нашай сям'і, дык гэта брат. На самых першых сваіх фота ён заўсёды з нейкім пісталетам ці аўтаматам. Любімай гульнёй у яго была вайна з алавянымі салдацікамі. Маляваў ён усё генералаў і генералісімусаў, абчапляных стужкамі, пагонамі і ордэнамі з медалямі. Таму цацачная зброя ператварылася ў сапраўдную. Ягоныя лукі і рагаткі мелі даволі моцную сілу. А ў дзевятым класе ён набыў пісталет і кінуў школу. Шаснаццаць гадоў самы ўзрост каб займець уласны баявы пісталет і паслаць адукацыю к чортавай матары. З пісталетам у кішэні Мірык хадзіў на кватэры, дзе гулялі ў карты на грошы. Чым бы гэта ўсё магло скончыцца – можна толькі здагадвацца. Але лёс зрабіў такі расклад... Брат закахаўся, праз тое каханьне трапіў у бальніцу, з бальніцы ў школу рабочай моладзі, дзе за магільнае

маўчаньне ставілі моцнае «тры», са школы ва ўнівэрсітэт, а з унівэрсітэту ў войска. Галоўнае нечага моцна захацець у жыцьці, і жаданьне спраўдзіцца. Хочаш зброю? На табе палігон. Паўтары гады брат праслужыў на палігоне ў Чэхіі на самай мяжы з радзімай усіх войнаў і ўсёй зброі – Германіяй. Настраляўся на ўсё астатняе жыцьцё. Часам здараюцца рэцыдывы. Яму, як афіцэру, без праблемаў далі дазвол на паляўнічае ружжо. Ён і скрыню жалезную замовіў, нават дзьве скрыні: большую для стрэльбы, меншую для патронаў. Але ў апошняе імгненьне адмовіўся і ад скрынак і ад стрэльбы. Захваляваўся, а раптам сын улезе, бяды наробіць... Чэсь – сын – вельмі на брата падобны, і ўзрост гэты збройны антыадукацыйны набліжаецца. «На чорта мне ружжо?! Я і так любога харка голымі рукамі задушу, а калі не змагу – ты дапаможаш...», – разважаў брат, п’ючы чорную гарбату з японскага кубка. «Харка задушыць? Канешне дапамагу, няма пытаньняў».

### *СНЫ*

Больш як дзесяць гадоў я працую з братам. Раней, у маладосьці, былі ілюзіі, што некаму можна давяраць, адна за адной тыя надзеі пакрышыліся, ад адных і сьлядоў не засталося, а іншыя папакідалі ў памяці шнары на ўсё жыцьцё. Вельмі балюча, калі прадае лепшы сябар ці каханая жанчына перакідаецца ў драпежную хцівую фурыю... Тата памёр, мама састарэла, і я аберагаю яе ад перажываньняў, давяраю толькі брату. У мяне ад брата сакрэтаў няма. Ёсьць сякія-такія дробныя недагаворанасьці, наконт творчых планаў да летуценных каханьняў. Улюбчывы я занадта ў параўнаньні з братам. А так ён пра мяне ведае ўсё. Наколькі адзін чалавек можа ведаць усё пра другога. Я ганаруся тым, што ёсьць чалавек, якому можна верыць. Звычайна, каб схаваць сваё нявер’е ў людзей, гаворыцца пра веру ў Бога, у Цуд, у Лёс. А як можна верыць у Найвышэйшае, калі сваім родным не давяраеш? А большасьць разумных, навучаная горкім вопытам здрады, нікому ня верыць. Пра дурняў няма гаворкі, яны самі сабе ня вераць. Я веру брату. Гэта важна. Важна на столькі, што зьязджаючы ў адпачынак, я дні тры-чатыры сьню адзін і той жа сон... Прыходжу на працу, вару каву, прыходзіць брат, мы п’ем ранішнюю каву і абмяркоўваем справы. Натуральна так гаворым, бывае, што і слушныя думкі прамаўляюцца. Тады я тэлефаную і пераказваю свой працоўны сон брату. Збольшага, праўда, гаворыцца малаўцямная абракадабра, можа ў сьне і былі разумныя думкі, але калі іх пачынаеш перацягваць на працоўны стол рэальнасьці, стройнасьць і логіка прападаюць. Зрэшты, у адпачынку свая логіка – добра адпачыць, каб вярнуцца і даць адпачыць брату, які працуе за двух.

### *ПРАДБАЧАНЬНЕ*

У кожнай справе галоўнае зазірнуць наперад. Ці то ты селянін і разважаеш пра будучы ўраджай, ці рамесьнік і думаеш, як выканаць замову і выгадней прадаць плён рук сваіх, ці як брат – літаратар, выдавец,

мысьляр. Яго здатнасьць бачыць будучыню мяне заўсёды радавала і дзівіла, бо сам я чалавек настрою, люблю хуткаплыннасьць, зменлівасьць, незавершанасьць... Таму ў мастацтве раблю накіды і шкіцы, у літаратуры пішу лірычную прозу, а ў выдавецтве кірую праектамі сезонных кніжак. Брат іншы, ён супрацьлегласьць мне, ягоная стыхія – доўгатэрміновыя праекты. Калі мы толькі распачыналі працу над Сусьветнай гісторыяй у 24 тамах, і толькі збіраліся выкасаваць цытаты марксаў-ленінаў, а факт паставіць вышэй усялякіх каментароў і трактовак, я толькі на працэнтаў трыццаць верыў у посьпех (які посьпех?!), у простае выкананьне працы памерам у 12 000 кніжных старонак. Брат верыў, ён бачыў гэтыя кнігі, ён бачыў іх дзесяціразовае перавыданьне, і пераўтварэньне ў ілюстраванае каляровае выданьне. Цяпер, калі нашыя кнігі па сусьветнай гісторыі налічваюць больш за сотню тамоў, а колькасьць замоваў толькі на гэтую тэму не зьмяншаецца, я магу любога скептыка падвесьці да паліцы з кнігамі і сказаць: мой брат здатны зазірнуць у будучыню, і ягоная здатнасьць увасобленая ў сотні ў тысячы тамоў тут перад Вамі.

## *ЯПОНІЯ*

Японія далёка-далёка, а Беларусь яшчэ далей. Каб убачыць і зразумець Беларусь трэба пісаць японскія вершы, трэба вывучаць і перакладаць Басё. Як гэта растлумачыць недасьведчаным? Ці трэба тлумачыць недасьведчаным і насіць ваду ў рэшаце? Пройдзе адзін час і надыдзе другі, адны недасьведчаныя адыдуць, а другія ўжо будуць ведаць, што Беларусь стала бліжэй, бо нехта пісаў хайку на палігоне ў гарах на самай мяжы з радзімай усіх войнаў – Германіяй, бо брат мой пераклаў зборнік Басё, і сем разоў той зборнік перавыдаваўся ў сталіцы адной з найвялікшых імперыяў сьвету Маскве. Там нейкі майстра зрабіў для таго зборніку вокладкі з цялячай скуры і каробку з дрэва, абклеіў каробку ядвабам і дарагой паперай. Кніга круцілася ў ярка асьветленай шкляной вітрыне і зіхацела, як каштоўны камень. Яе кошт быў большы за кошт двух залатых заручальных пярсьцёнкаў. Але я ня мог не набыць братаву кнігу. «Ці былі там яшчэ такія кнігі?», – спытаў Мірык. «Былі». «А ці былі сярод аўтараў жывыя?» «Не было».

## *ЦЕА*

У гісторыі мастацтва найузорнейшым прыкладам узаемаадносінаў братоў, адзін з якіх мастак, а другі – бізнэсовец, прынята лічыць стасункі Цеадора і Вінцэнта Ван Гогаў. Небеспадстаўна. Бо менавіта Вінцэнт, дзякуючы матэрыяльнай падтрымцы Цеадора, разбурыў міф пра неабходнасьць мастака быць інтэграваным у грамадства і дзеля рэалізацыі здольнасьцяў выконваць сацыяльныя замовы ці то царквы, ці то дзяржавы, ці то мецэнатаў. Лічыць Цеа мецэнатам Вінцэнта

нельга, бо нават каб не намаляваў той ніводнага палатна, брат усё адно дапамагаў бы хвораму брату чыста па-людску, як шмат хто іншы, калі мае магчымасьць, апякуецца бяднейшымі сваякамі. Жаданьне быць Ван Гогамі за кошт братоў распаўсюдзілася ў мастакоўскім асяродку з хуткасьцю чумы. Тысячы эпігонаў па ўсім сьвеце лічаць сябе роўнымі, а то й лепшымі за вялікага галандца, і патрабуюць-вымагаюць сродкі на існаваньне ад наіўных сваякоў. Сапраўды спакусьліва піць, гуляць, маляваць і ні за што не адказваць, нават за якасьць уласнага пэцканьня. З іншага боку, ахвяруючы невялічкія сумы, прыемна цешыць сябе думкаю, што ўтрымліваеш ня проста разбэшчанага п'янтоса і няздару, а ўкладаеш сродкі ў генія, якога праз пэўны час прызнае ўвесь сьвет. Безумоўна, Мірык хацеў бы, каб я стаў знакамітым, як Вінцэнт Ван Гог; бясспрэчна мне было б куды прыемней займацца выключна станковым мастацтвам і лірычнай літаратураю. Але нашыя ўзаемаадносіны падобныя да стасункаў вялікіх братоў якраз сваёй шчырасьцю, даверам. Міраслаў зьбірае мае малюнкі і паспрыяў выданьню збору маіх літаратурных практыкаваньняў, каб падтрымаць маю хісткую веру ў свае здольнасьці. Я занадта ўважліва вывучыў біяграфію Ван Гога, каб зразумець яе непаўторнасьць, унікальнасьць і драматызм. Самагубства Вінцэнта прывяло да самазабойства Цеа. Дробныя шарлатаны ад мастацтва замоўчваюць гэты сумны факт. І калі галандскі галерэйшчык, праз пасярэднікаў (усё брыдотнае чамусьці робіцца праз усьмешлівых пасярэднікаў) замовіў мне сцэнар фільма пра Ван Гога Менскага, я спытаў: «У жытнёвым полі ты, Ван Гог Менскі, страляцца будзеш?» «Не!» Пра ягонага брата, які ўтрымлівае майстэрню па вытворчасьці надмагільных помнікаў, я пытацца ня стаў і адмовіўся ад напісаньня сцэнару, бо Вінцэнт Ван Гог не існуе без Цеа.

### *ГАДЫ*

Наколькі я не люблю павукоў, зьмеяў, шэршняў, чарапахаў, восаў, настолькі іх любіць і заўсёды любіў Мірык. Ён чытаў пра іх кнігі, кшталту Халіфмана пра пчолаў, ён маляваў іх, лавіў, садзіў у загадзя падрыхтаваныя скрыначкі і слоікі, разглядаў праз павелічальнае шкло і вельмі дзівіўся, калі нехта ня ведаў колькі лапак у тарантула, ці які максімальна сустрэты памер зьмяі-мядзянкі. Каб бацькі толькі дазволілі, у нашай кватэры абавязкова зьявіўся б тэрарыюм, а так братавае захапленьне гадамі абмяжоўвалася жукамі і восамі. Ён іх сапраўды любіў настолькі, што яны яго не кусалі. А мяне... Мяне джыгнуў шэршань, ад аднаго ўспаміну пра той выпадак скура на шчаках шэрхне, а вушы пачынаюць гарэць... Мы жылі каля возера, на Браслаўшчыне. Для ўсялякіх гадаў там проста рай. Калі казачны чорт угаварыў дурнога беларускага мужыка развязаць мех з гадамі, якіх

Бог загадаў вартаваць, дык тое здарылася не на Палесьсі, а на Браслаўшчыне. Мірык з раніцы да ночы тых гадаў лавіў, садзіў у скрыначкі і ставіў на падваконьне. Лета стаяла задушлівае, і я завёў сабе звычку адпачываць – чытаць і спаць пасярод дня. Чытаючы, я адчуў, як ражок падушкі нязручна ўпёрся мне ў шыю, я паправіў ражок... Толькі гэта быў шэршань-уцякач. Кінжальны боль працяў маю шыю навылёт, скура на твары зморшчылася, вушы распухлі, язык запоўніў увесь рот, вочы вырачыліся і перасталі міргаць. У гняўлівым шале я разьбіў, патрушчыў, паламаў усю брату калекцыю гадаў і жамярынаў. Дзень мы не размаўлялі, а ўвечары дамовіліся, што ўсё злоўленае ім будзе адразу ж умярцьвяцца. Забіраць жыцьцё ў гадаў Міраслаў навучыўся хутка і робіць гэта па-майстэрску.

## *КАРТЫ*

Шмат якія адкрыцьці і праекты, зробленыя Міраславам, прыпісваюцца мне. Грамадству, пэўна, так лягчэй; лепей трываць аднаго авантурыста, чымсьці дваіх. І яшчэ я вельмі люблю інтэрв'ю, як літаратурны жанр, калі маеш справу з процьмаю самых ідыёцкіх пытаньняў і спрабуеш, не выкідаючы іх, зрабіць чытэльны тэкст, ці разыграць сцэнку перад мікрафонам ці камераю. Проста я больш публічны чалавек. Але вернемся да чыста Міраслававай ідэі выдаваць карты. Звычайна, карты выдаюць дзяржавы, на карты ў дзяржаваў манаполія, як і на большасьць рэчаў, зьвязаных з азартам. Каб гэта ведаць, пэўна, трэба ў маладосьці набыць пісталет, кінуць школу і на падпольнай кватэры гуляць у прэферанс на вялікія грошы. Зброя, у дадзеным выпадку, доказ братавага практыцызму і ягонай неазартнасьці. Руляй лёгка супакойваецца штучная істэрыка і астуджваецца азарт сквапных гульцоў. Спасьцігнуўшы сакрэты картачных гульняў, братаў розум быў цалкам падрыхтаваны ў патрэбны момант, калі дзяржава СССР разбурылася, а Рэспубліка Беларусь ня ўстала на ногі, сказаць: «Карты будзем друкаваць». Ад ідэі да рэалізацыі шлях быў доўгі і няпросты. Асабліва мярзотна выглядалі два моманты. Замовы на паліграфічную прадукцыю не адкрываліся без хабару. Пры дырэктарах існавалі хабараносцы. Колькі яны заносілі дырэктарам, а колькі пакідалі сабе, без пісталета не разьбярэшся, але на той час зброі ў Мірыка не было. Другі брыдкі момант: фабрыка адмовілася складаць карты ў каробачкі. Пэўна, хабараносец шмат недадаў хабарніку-дырэктару, і мы атрымалі асобна «каралёў» і асобна «шасьцёркі». Нанятыя намі людзі больш за год складалі і прадавалі тыя, выдатна намалёваныя мастаком Чарыновічам, карты. Праект быў геніяльны і прыдумаць яго мог толькі брат. І галоўнае, у час, калі імперыя зла зруйнавалася, а новыя незалежныя дзяржавы толькі ўздымалі свае сьцягі, ніякіх іншых карт акрамя нашых на рынку проста не было.

### *СКУРА*

Наколькі ў Мірыка цёмная, татава, скура, якая загарае за адзін сонечны дзень і ніколі ня ведае ніякіх апёкаў, настолькі ж у мяне белая, маміна, скура, якая ўвесь час згарае на сонцы. Але ні я, ні ён ня любім ляжаць на сонцы. Валяцца каля мора ці рэчкі – ня наш занятак. Ісьці ўздоўж вялікай вады – гэта нашае, гэта любіў тата, люблю я і любіць брат.

### *ПСЕЎДАНІМ*

Напачатку сваёй творчасьці Мірык узяў за псеўданім прозьвішча татавай маці – Шайбак, што ў перакладзе з цюрскіх моваў азначае «сад у квецені». Пад Навагрудкам, адкуль паходзіць род нашага бацькі, ёсьць цэлае мястэчка Шайбакова, дзе жывуць нашчадкі тых ваяроў, што баранілі Вялікае Княства ад усходніх і заходніх захопнікаў. Шайбак – прозьвішча крымска-татарскага хана. Гучны ў брата псеўданім. Але потым ён вярнуўся да подпісу Міраслаў Адамчык, чым вельмі ўсьцешыў тату. Нейкіх уцямных тлумачэньняў гэтай зьмены я ад брата ня чуў, бо ня вельмі дапытваўся. Гэта яго асабістая справа. А тым больш надыходзіў час, калі нашыя подпісы на кнігах мяняліся ледзь ня з кожнай новай публікацыяй, бо ў Расеі прозьвішча Адамчык стала настолькі вядомым і настолькі неадназначным, што маскоўскія кнігагандляры папрасілі, дзе толькі можна зьняць нашае сапраўднае прозьвішча. Зрэшты, усе мастакі так ці інакш, раней ці пазьней карыстаюцца псеўданімамі. Як мне, дык найлепшы ў брата быў подпіс Міраслаў Шайбак. Што можа лепш цешыць пагляд, як сад у квецені? Хто не зразумеў прыгажосьць кветкі, той не зразумеў жыцьця...

### *ОРДЭН*

Дзейнасьць майго брата заслугоўвае ўзнагароды. Ну хоць бы за тое, што ён стварыў выдавецтва «Сучасны літаратар», якое ў 2000 годзе стала буйнейшым замежным выдавецтвам, што працуе ў Расеі. На маскоўскім кніжным кірмашы выдавецтва атрымала дыплом і скульптуру – глінянага Івана Фёдарава, таго самага, што вучыўся ў нашага Пятра Мсьціслаўца. За гэты дыплом у нас разы тры прасілі грошы: на падтрымку часопісу «Кніжны бізнэс», на газету «Кніжны агляд», якая разоў дзесяць аблівала гразёю і нашае выдавецтва, і нашыя кнігі, і нашае прозьвішча, на рэкламу таго ж кірмашу. Не далі. Мірык сказаў «не». Ён сказаў «не», а яны сказалі «так» і дыплом далі, каб прапанаваць ордэн «Георгіеўскі крыж» з уручэньнем у Крамлі. Без уручэньня – 2000, з уручэньнем – 5000. Як пры дырэктарах фабрык былі хабараносцы, так і ў Крамлі яны ёсьць. І агульная дэталь, ты ніколі не даведаешся ці дайшоў

твой хабар да таго Крамля. З-за гэтай няпэўнасьці брат адмовіўся ад «крыжа». Не гатовы ён стаць «крыжаносцам», хоць і заслужыў-зарабіў на «Сьвятога Георгія».

### *10 КІЛАМЕТРАЎ*

У дзяцінстве брат не хадзіў ні ў якія спартовыя секцыі, нават школьныя заняткі па фізкультуры ігнараваў, даставаў праз знаёмых даведкі, што нібыта забараняліся яму фізічныя нагрузкі. Можна ўявіць, як фізрукі ненавідзяць такіх вучняў. Аднаго фізрука Мірык давёў да таго, што той прылюдна абазваў брата «мяшком з гаўном». Скандал дайшоў да дырэктара школы і наіўнага, а ўсе школьныя фізрукі мякка кажучы – наіўныя, перавялі выкладаць у другія класы. Выглядала на тое, што спорт і брат ніколі не перакрыжуюцца. Ды не... У войску спатрэбілася сіла, розуму было замала, каб шнураваць і ганяць маладых салдатаў. Кулак у войску такі ж аргумент, як і слова. Нават ня так... Кулак, а ня зброя, аснова войска. Мао памыляўся, ня стрэльба нараджае ўладу, а кулак нараджае ўладу. Зброя можа нарадзіць дзяржаву, дзяржаўную ўладу, але ня здатная стварыць уладу ў чыстым – біялагічным выглядзе. Мірыкаў кулак прынёс і ўладу, і званьне, і адпачынак за выдатную службу на мяжы сацыялістычных і капіталістычных лагераў. З войска брат прыехаў байцом. Колькі разоў мне нават даводзілася станавіцца паміж братавым кулаком і прадстаўнікамі прытручанай алкаголем і гнілавата-баязьлівай дысідэнцка-савецкай інтэлігенцыяй. Сіла чамусьці не цанілася ў антысавецкіх багемных колах, усе спадзевы былі на творчасьць і розум, прынамсі ў Беларусі было так. Мірык паверыў у гэтую ілюзію і надоўга закінуў спорт. Толькі ўсё вяртаецца, калі ёсьць куды вярнуцца. Усё бяжыць, калі ёсьць воля бегчы. Мірык прабягае ў дзень 10 кіламетраў, гэта звычайна, а калі стаміўся ці прыхварэў – бяжыць 6. У яго трэнажор. Брат не любіць бегаць па вуліцы, дзе дурныя сабакі ўсё ж не разумнейшыя за гаспадароў, бо разумеюць, што кулак нараджае ўладу. Брат бяжыць па трэнажорнай дарожцы, бо можа сабе дазволіць мець у кватэры спартовую залу.

### *11 СЛОВАЎ*

1979 год нічым асаблівым у зьніштажэньні беларускай культуры не вылучаўся. Савецка-таталітарная сістэма, грунтуючыся на спадчыне Расейскай імперыі, вынішчала ўсё іншароднае. Беларусы, хоць і лічыліся за сваякоў расейцаў, падлягалі абязмоўліваньню, абезкультурніваньню, русіфікаваньню, што замянялася тэрмінам «асавечваньне», як цяпер вайна завецца «барацьбою з тэрарызмам», а воін варожай дзяржавы – «тэрарыст». Безудзельна глядзець на зьнікненьне роднай культуры, ці яшчэ горш – апраўдваць такі гвалт брат, як і я з сябрамі, ня мог. А што мы маглі? Маглі даць адзін аднаму слова, што пакуль

жывем, датуль і мова наша і культура будуць жыць. Мова жыве ў сказе. Сказ – завершаная думка. Шмат словаў ня трэба, каб выказаць ясную думку. 11 словаў дастаткова, каб збудаваць выразны сказ. Кожны паабяцаў штодня пісаць ня меней за 11 беларускіх словаў. Каб замацаваць дадзенае слова мы выбілі на руках татуіроўкі з лічбаю 11. Лічба пісалася па-старажытнаславянску і складалася з адпаведных літараў і цеслы над імі – так славяне запісвалі лічбу 11. Хутка чвэрць стагоддзя міне, як мы пішам свае беларускія словы, хто ў артыкулах, хто ў сцэнарах, хто ў вершах, хто ў дзёньніках. За гэты час беларуская культура і мова перажыла і росквіт у час абвяшчэньня незалежнасьці беларускай дзяржавы, і заняпад пасьля ганебнага рэферэндуму, калі палітгарлапаны ставілі пад сумніў яе вартасьць і патрэбнасьць. Мярзотныя настроі выклікаюць яшчэ і бясконцая чарада ўцёкаў на эміграцыю беларускіх палітыкаў, літаратараў, мастакоў, журналістаў, студэнтаў... Іх кволыя артыкульчыкі, нашрайбаныя за жменьку цэнтаў дрыжачай рукою, ня могуць выклікаць нат спачуваньня. А ці патрэбны каму нашы 11 беларускіх словаў? Патрэбны. Мне дастаткова ведаць, што маё беларускае слова патрэбна брату.

## *СКАЦІНА*

Біць скаціну – вялікае майстэрства. Далёка ня кожны зможа закалоць кабана, ці хоць бы папрысутнічаць пры тым заколваньні. Брат б’е скаціну па-майстэрску. Навучыўся ён гэтаму мужчынскаму рамяству на бульбе. Студэнтаў ганялі выбіраць калгасную гародніну. Гатаваць яны мусілі сабе самі. На сотню дзевак на філалагічным факультэце, дзе вучыўся брат, было менш за дзесяць хлопцаў, адпаведна на мужчынскую работу – упраўляцца з коньмі і біць скаціну – выбар быў не багаты. Каб накарміць сто ратоў, штодня трэба было або цяля забіць, або падсьвінка зарэзаць. І ня толькі забіць, а і скуру злупіць і разабраць. Біцьцё скаціны – работа цяжкая, жывое-маладое паміраць ня хоча, супраціўляецца, рвецца, трапечацца... Яшчэ Эзоп заўважыў вінаватасьць жывёлы ў тым, што нам хочацца есьці, асабліва пасьля цяжкай працы ў полі, дзе зноў жа зьбіраецца харч, каб карміць іншых... Колазварот харчаваньня, бясконцая давільня прыроды... За месяц брат так прапах водарам жывёльнай сьмерці, што вясковыя сабакі, толькі ўчуўшы яго, змаўкалі, падціскалі хвасты і хаваліся ў будкі.

## *РАЗМОВЫ*

Ёсьць шмат рэчаў, пра якія магу пагаварыць толькі з братам. Пра падарожжы... Мы разам езьдзілі ў Афрыку. Тата яшчэ спытаў: раскажыце пра пустэльню... Я спрабаваў апісаць словамі той жах, які выклікае бясконцая хвалістасьць пяска пад цалкам пустым небам. Аповяды ня ўражвалі. А ў размове з братам, мне дастаткова сказаць: «Памятаеш

Сахару?», каб ён зразумеў. Месіва іклатых і кіпцюрастых рэптыліяў на кракадзілавай ферме, дзе смурод гніеньня ўвабраў у сябе ўсе найсмуродлівейшыя водары Зямлі, таксама можа ўспомніць толькі брат. Як толькі я магу зразумець, чаму ён вырашыў аб’ехаць Калізей на кані. Падарожжы – лірыка, грошы – кроў эканомікі нашай вялікай сям’і. Сур’ёзна пра капітал толькі з братам і гавару. Грошы – рэчыва вадкае, патрабуе штодзённага дагляду, патрабуе новых формаў. Таму адной размовы ў дзень пра фінансы нам замала. А ёсьць такія дні, калі мы зачыняемся і дзень навылёт гаворым толькі пра грошы. Сям’я, як і грошы, таксама аб’ект зьменлівы і непрадказальны. Тут у нас погляды розьняцца, але разуменьне захоўваецца, у сям’і галоўнае разуменьне і дараваньне недаравальных учынкаў. Таму нам лёгка, адносна лёгка, гаварыць пра нашыя недахопы і памылкі, ведаючы, што можна ня толькі сказаць, а і паверыць, што цябе пачуе хоць бы адзін чалавек. А яшчэ з братам магу пагаварыць пра мару. Не саромеючыся, сказаць пра самае патаемнае, якім бы прымітыўным і плыткім яно не выглядала звонку, як тое скаканьне на кані па Рыме, вакол вечнага Калізею.

### *ЧОРНАЯ РУКА*

Больш гавораць пра расейскае п’янства і меней пра зладзейства, хоць варта гэтыя заганы расейскага народу памяняць месцамі і паверыць Салтыкову-Шчадрыну, які на пытаньне імператара ахарактарызаваць адным словам расейскі народ, сказаў «крадуць», а не сказаў «п’юць». У брата ўкралі п’есы. Прыехаў у Менск віхлясты хлюст з часопісу «Пионер», выпрасіў п’есы, ажно чатыры – «Чорная рука», «Белая прасьціна», «Чырвоная пляма» і «Пацук-людажэр», і зьехаў... Не, ён не прапаў, ён даслаў ліст, у якім прапаноўваў перарабіць п’есы ў аповесьць. У хлюста было вельмі літаратурнае прозьвішча: Шаўчэнка. Ня менш літаратурнае прозьвішча было і ў таго аўтара, які ўсё ж зрабіў з п’есаў аповесьць, Усьпенскі. Толькі – гэта ня бацька расейскай педагогікі Усьпенскі, а той Усьпенскі, які выдумаў Чабурашку і розную падобную дрэнь. Не скажу, што Мірык прыдумаў Чорную руку, нават пісаць літаратурныя творы на матыў дзіцячых фолк-гісторыяў пра гарадскія жахі ён пачаў з Клімковічам, зразумела, што ня аўтарам ажно двух гімнаў Беларусі, а Максімам Клімковічам, які стварыў першы нова-беларускі дэтэктыў «Сцэнарый сьмерці». Карацей п’есы пакралі і перарабілі ў аповесьць. Што-небудзь давесьці ў судзе немагчыма, ды што гэта за пісьменьнік, калі ён у судзе адстойвае аўтарскія правы... Літаратар даводзіць сваю праўду творамі. Напісаныя у нашым выдавецтве аповесьці пра Чарапашак-ніндзя проста замачылі чабурашак на рынку. І калі пакрыўджаны Усьпенскі абураўся на тэлеэкране і заклікаў расейскіх дзяцей не чытаць кнігі пра амерыканскіх чарапашак-ніндзя, брат толькі пасьміхаўся, бо якія яны амерыканскія, калі яны ніндзя,

калі клічуць іх Леанарда, Мікеланджэла, Данатэла і Рафаэль, а напісалі іх у менскім выдавецтве «Літаратура».

### *ВЫБАР*

Выбіраючы паміж сябрам і братам, заўсёды выбіраў брата.

### *ПАДАРУНКІ*

Брат любіць рабіць падарункі. Больш скажу, ён робіць падарункі заўсёды завышанага кошту. Што б ні казалі, а выбіраючы падарунак, мы так ці інакш ацэньваем чалавека, якому зьбіраемся зрабіць прэзент. Чым большая неадпаведнасьць у кошце і сітуацыі, чым большая розьніца паміж уласнымі магчымасьцямі чалавека нешта сабе набыць, тым большы шанец яго прынізіць і зьняважыць сваім шырокім жэстам. Адна справа падарыць свайму супрацоўніку на юбілей трэць ягонага месячнага заробку. Іншая рэч, таму ж супрацоўніку набыць кватэру ў крэдыт, калі памер крэдыту перавышае трохгадовы заробак. У першым выпадку супрацоўнік будзе вельмі ўдзячны і набудзе сабе сьпінінг і блёсны для ловаў шчупака. У другім варыянце ён зазлуе і паспрабуе ўсімі праўдамі і няпраўдамі ўцячы ад цябе. Ні пра якую ўдзячнасьць ў выпадку з кватэраю чакаць не даводзіцца. Брат падарыў людзям пяць кватэраў. Ня без майго ўдзелу, тое рабілася, але ініцыятыва зыходзіла ад яго. На навасельлі ён быў толькі ў адной з пяці кватэраў. «Нічога страшнага, што твой учынак, твой падарунак не ацанілі цяпер, галоўнае твой жэст запомнілі, запомнілі назаўсёды. Нават і добра, што людзі не разумеюць значнасьці твайго ўчынку і каштоўнасьці падарунку, чым надалей адкладаецца іх удзячнасьць, тым лепей», – разважае брат.

### *КАРОНКА*

Бываюць рэчы, якія мяне страшэнна раздражняюць у паводзінах брата. Хоць бы ўзяць жалезную каронку на зубе. Служба ў войску прывучыла абыякава ставіцца да ўласнага аблічча. Зьявілася самурайская суіцыднасьць у паводзінах. Ад кепскага харчаваньня ў Мірыка пачалі развальвацца зубы. Ягоных роўных вялікіх зубоў яму было не шкада. І ў кароткім адпачынку яго ледзь угаварылі паставіць на зубы металічныя часовыя каронкі. Прыйдзеш з войска, памяняеш... Прыйшоў і яшчэ гадоў пяць бліскаў жалезнай усьмешкаю. Паступова вярнулася стыльнасьць аблічча: чаравікі, касьцюм, гальштук, роўная акантоўка валасоў, механічны гадзіннік, скураны пас... Нарэшце зьнікла і жалеза з усьмешкі. Канешне, я мог пераканаць яго і раней зьняць каронкі, але нашто раздражняць адзін аднаго па розных чыста зьнешніх рэчах?

## *СКАНДАЛ*

Брат ня любіць скандалы. Хто іх любіць? Толькі бізнэс ёсьць бізнэс, і надыходзіць момант, калі хочацца набыць пісталет і зьняць праблему. Каб не набываць зброю, каб не выкарыстоўваць кулак, даводзіцца павышаць голас. Аднойчы брат так крычаў на людзей, вінных нам грошы, што сьвядомасьць пакідала яго, а калі вярталася, даўжнікі, што імгненьне назад стаялі зусім побач, былі ўжо за метры тры ад брата. Калі сьвядомасьць вярнулася другі раз, даўжнікі былі далёка-далёка, у самым канцы даўжэзнага калідору. Дзіўна, але ўзброеная ахова тых людзей зусім не рэагавала на крык, пэўна, яны навучаныя прыпыняць фізічную, а не вярбальную агрэсію. Брат крычаў пра куплёныя ордэны і званьні акадэмікаў, пра гандаль міністэрскімі партфелямі і разбазарваньне агульных сродкаў на непатрэбныя камандзіроўкі і ўтрыманьне раздзьмутага штату супрацоўнікаў, пра абяцанкі-цацанкі і нетрыманьне слова. Ён усё казаў слушна і лагічна, ён не лаяўся, не абражаў, не параўноўваў людзей з жывёламі... Ён браў крыкам і ўзяў, бо пасьля тэлефонных прабачэньняў усе зрабілі выгляд, што ніхто ні на кога не крычаў. Важна, што брат умее крычаць да страты сьвядомасьці.

## *ДРАМАТУРГІЧНАСЦЬ*

Гадоў з 10 у менскім тэатры «Вольная сцэна» ідзе братава п'еса «Чорны квадрат», кабарэ-дэтэктыў пра Казіка Малевіча і Віцебск 20-х гадоў рэвалюцыйнага стагоддзя. Каб у Менску былі вартыя павагі тэатры, брат пісаў бы п'есы. Павагі да беларускіх тэатраў у брата няма. Яму сорамна глядзець тутэйшыя сьпектаклі. Але жаданьне ствараць драматургію ў кішэнь не схаваеш. Адно гатэльнае перасяленьне чаго вартае. Пачалося ўсё з паломкі аўтобуса. Заглох ён у джунглях. З аднаго боку дарогі была вада, якая называлася Сіямскім морам і плаўна пераходзіла ў Індыйскі акіян, з другога боку джунглі – варухлівае пыльна-зеленкаватае месіва з флоры і фаўны. Над аўтобусам вісела тайландскае сонца, якое стварала на дарозе саракаградусную гарачыню. Пакуль шафёры поркаліся ў маторы, мужчыны спраўлялі патрэбы перад аўтобусам, а жанчыны – за ім, брат прыдумаў п'есу. Трэба ўдакладніць, што людзі, здатныя дабрацца з Менску да тайландскіх джунгляў, дзе ў той час дажываў свае апошнія дні крыважэрны сацыяліст Пол Пот, мелі ўсе характарыстыкі байцоў. Сутнасьць п'есы – помста за пакуты ў джунглях. Ідэя – мы павінны пасяліцца ў лепшы гатэль, чым нам прапануюць. Калі аўтобус быў адрамантаваны і прывёз нас у патайскі чатырохзоркавы гатэль, брат нібыта незнарок гучна кінуў падпальны сказ: «Я ж казаў, гатэль будзе найхеровейшы!» І пачалося... «Ды мы ня будзем тут жыць!» «Сьметніца, а не гатэль!» «Шукай нам нармальнае жытло...» Адказныя за расьсяленьне сварыліся і расьсялялі людзей шэсьць

гадзінаў... Я пасьпеў паплаваць у моры, паспаць і павячэраць, пакуль дайшла нашая чарга перасяляцца. Нас прывезьлі ў цудоўны шматпавярховы шкляны будынак з вялікім басейнам і фантанам у фае. Вакол басейну стаялі сьветлыя лакіраваныя сталы, на адным з якіх была засьцеленая газета, на якой стаяла бутэлька «Сталічнай» і ляжаў накроены хлеб з салам. Тры бандзюганы пілі гарэлку проста з рыльца. Ну няма ў Тайландзе чарак, няма, а піць гарэлку з рыльца ці з кубка – бяз розніцы. Убачыўшы нашага гіда-паляка, адзін з бандзюганаў узрадаваўся і сказаў: «Што, пшэк, ты ўсё дурыш рускага брата!» Тут і пачалася мая маленькая роля... «Паехалі назад!» «Як назад, гэты гатэль лепшы...» – паспрабаваў спыніць мяне пшэк. «Рускія тут. Рускія. Тут жыць нельга!» «Разумею, рускія...» Па дарозе ў стары гатэль брат расказваў, як напіша п’есу пра скандал у гатэлі. Не напісаў... Зрэшты, напісаць напісаў, проста не запісаў яшчэ.

### *КАЗКІ*

Яшчэ з дзяцінства я не любіў казкі з «харошым» заканчэньнем. Звычайна: нейкі ўмоўна станоўчы герой забівае так званага адмоўнага, каб не скончаць забойствам, а скончыць вясельлем, станоўчы яшчэ забірае ў адмоўнага жонку-палоньніцу, ну а розных там вядзьмарак-плят-карак разьдзірае на баране. Такія заканчэньні лічацца харошымі, а не харошым заканчэньнем казкі можна лічыць такі: «Бяжыць брат-забойца па лесе, а Поўня за ім бяжыць; бяжыць брат-забойца па полі, а Поўня за ім ляціць. І бачыць брат-забойца на Поўні ясны твар свайго забітага брата». Так заканчваецца беларускі казачны пераказ біблейскага сюжэту пра Каіна і Авеля. Менавіта яго я хацеў праілюстраваць у час заняткаў у мастацкім інстытуце. Тэму не зацьвердзілі. Можа і правільна зрабілі, бо грамадству больш падабаюцца вясельлі, перамогі над цмокам і панаваньне дабра над злом. Разважаць пра месца граху братазабойства хто захоча? Я, бо лічу што першародны грэх Бога перад чалавекам – гэта якраз правакаваньне Каіна забіць Авеля. Чым Каінаў хлеб быў горшы за Авелява ягня? Бог паставіў Авеля над Каінам, Каін загневаўся і забіў брата. Брат забіў брата... Што можа быць горш? Нічога. Чаму ў словах пра брата Міраслава я закрануў Поўню, з якой Авель глядзеў на Каіна. А таму, што я не хацеў бы, каб нехта, ведаючы простую схему правакацыі апісанай у Бібліі, пасварыў нас, не хацеў бы нават, каб гэта быў сам Бог.

*18–25. 07. 2002.*